Иногда лэпбук организуется по когнитивному принципу: наряду с карманами, ориентированными на развитие речи и познание окружающего мира, предусмотрены вкладыши, которые развивают сенсорные эталоны ребёнка, его представления о цвете, форме, последовательности событий (например, вкладыш-гармошка с рисунками о том, что и в какой последовательности нужно надевать; пазл, где нужно соединить фрагменты зимней картины; задания-находилки, где нужно найти иллюстрации зимы, предметы определенной формы).

**Заключение.** Независимо от структуры лэпбука, он сохраняет свою главную образовательную ценность при работе с детьми дошкольного возраста — ценность индивидуального развития личности ребёнка и индивидуализации обучения. Для каждого ребёнка в лэпбуке найдется своё окошко, свой конверт, который отражает его личный познавательный интерес в соответствии с его индивидуальным темпом развития. Поэтому, используя лэпбук в своей работе, воспитатель получает возможность практиковать индивидуальный подход к ребёнку и проводить корректирующую работу в соответствии с потребностями и интересами каждого ребёнка группы, причём как на этапе изготовления лэпбука, так и на этапе работы с этим наглядным пособием.

Организация совместной работы педагога и ребёнка по изготовлению индивидуальных лэпбуков, исходя из интересов ребёнка, является наиболее перспективным направлением дальнейшего развития данного метода [5, с. 148]. В последнее время к изготовлению элементов лэпбука всё чаще привлекают родителей, которые помогают детям в домашних условиях подготавливать материалы на заданную тему. Так, лэпбук является также средством реализации взаимосвязи учреждения дошкольного образования с семьями воспитанников.


**Список цитированных источников**

1. *Блохина, Е.* Лэпбук — «наколенная книга» / Е. Блохина, Т. Лиханова // Обруч. — 2015. — № 4. — С. 29—30.
2. *Гатовская, Д. А.* Лэпбук как средство обучения в условиях ФГОС / Д. А. Гатовская // Проблемы и перспективы развития образования : материалы VI Междунар. науч. конф. — Пермь : Меркурий, 2015. — С. 162—164.
3. *Игнатенко, О. Н.* Лэпбук как средство обучения в условиях ФГОС / О. Н. Игнатенко, Е. С. Рогачёва // Альм. мировой науки. — 2017. — № 1—2 (16). — С. 19—21.
4. *Андрюшина, Н. Н.* Лэпбук как нетрадиционная форма работы с детьми на логопункте дошкольной образовательной организации / Н. Н. Андрюшина // Детство как антропологический, культурологический, психолого-педагогический феномен : материалы III Междунар. науч. конф. (в рамках проекта «А.З.Б.У.К.А. детства»). — Самара : Науч.-техн. центр, 2017. — С. 84—86.
5. *Габидуллина, Е. В.* Лэпбук и его возможности в развитии детей старшего дошкольного возраста / Е. В. Габидуллина // Перм. пед. журн. — 2015. — № 7. — С. 146—148.



УДК 378.046.4+811.161.3



**Труханові Марыя Эдуардаўна**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», Мінск, Рэспубліка Беларусь, marie29a@yandex.ru*


# СТВАРЭННЕ ЎМОЎ ДЛЯ АКТУАЛІЗАЦЫІ І АСВАЕННЯ КІРАЎНІКАМІ СУЧАСНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫХ АСНОЎ ЭФЕКТЫЎНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ВА ЎСТАНОВАХ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ


У артыкуле абаснавана актуальнасць павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў па пытаннях эфектыўнага выкарыстання беларускай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Раскрыты змястоўныя кампаненты павышэння кваліфікацыі, накіраванага на засваенне кіраўнікамі ўстаноў дашкольнай адукацыі арганізацыйна-метадычных асноў выкарыстання беларускай мовы.



**Ключавыя словы:** арганізацыйна-метадычныя асновы; беларуская мова; кіраўнік установы дашкольнай адукацыі; павышэнне кваліфікацыі.



**Trukhanovich Mariya Eduardovna**

*Academy of Postgraduate Education, Minsk, Belarus, marie29a@yandex.ru*


# CREATION OF CONDITIONS FOR UPDATING AND MASTERING BY MANAGERS OF MODERN ORGANIZATIONAL AND METHODOLOGICAL BASES OF EFFECTIVE USE OF THE BELARUSIAN LANGUAGE IN PRESCHOOL EDUCATIONAL INSTITUTIONS


The article substantiates the relevance of professional development of managers on the effective use of the Belarusian language in preschool educational institutions. The article reveals the content components of advanced training aimed at mastering organizational and methodological foundations of the use of the Belarusian language by the heads of preschool educational institutions.



**Key words:** the organizational and methodological foundations; the Belarusian language; the head of preschool education; the advanced training.



© Труханович М. Э., 2020





Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Змены, якія адбыліся апошнім часам у змесце нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць сістэмы дашкольнай адукацыі, у вучэбна-праграмнай дакументацыі дашкольнай адукацыі патрабуюць перагляду падыходаў да арганізацыі дзейнасці, накіраванай на забеспячэнне якасці адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі задач адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Неабходна адзначыць, што гэтыя змены датычацца не столькі нават груп з беларускай мовай выхавання і навучання, у якіх звычайна працуюць выхавальнікі дашкольнай адукацыі, якія валодаюць на дастатковым узроўні беларускай мовай, колькі груп з рускай мовай выхавання і навучання. Перад выхавальнікамі дадзеных груп таксама стаяць задачы, абумоўленыя патрабаваннямі адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі да ўзроўню падрыхтаванасці выпускнікоў установы дашкольнай адукацыі ў адукацыйнай галіне «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», а таксама праграмным зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Новыя падыходы да эфектыўнага выкарыстання беларускай мовы неабходныя ва ўсіх установах дашкольнай адукацыі, бо толькі такім чынам магчыма забяспечыць адпаведнасць дзейнасці патрабаванням адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі.

**Асноўная частка.** Задачы вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі абумоўліваюць неабходнасць стварэння ва ўстановах дашкольнай адукацыі пэўных арганізацыйна-метадычных умоў, якія спрыяюць іх рэалізацыі. У першую чаргу дадзеныя ўмовы ўключаюць наяўнасць прафесійна-маўленчай гатоўнасці педагагічных работнікаў да маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту на беларускай мове. Ад выхавальніка дашкольнай адукацыі яшчэ на ўзроўні груп ранняга ўзросту з рускай мовай навучання і выхавання патрабуецца ў дастатковай ступені валодаць беларускай мовай.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у інструктыўна-метадычным пісьме да гэтага навучальнага года «Аб арганізацыі ў 2019/2020 навучальным годзе адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю» з мэтай стварэння ўмоў для авалодання выхаванцамі дзвюма дзяржаўнымі мовамі рэкамендуе рэалізоўваць змест адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, пачынаючы з групы другога ранняга ўзросту. Пры рэалізацыі зместу адукацыйнай галіны «Мастацкая літаратура» ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці, пачынаючы з групы другога ранняга ўзросту, ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання выкарыстоўваюцца творы мастацкай літаратуры і фальклору на беларускай мове, ва ўстановах адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання — творы мастацкай літаратуры і фальклору на рускай мове. Навучанне і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту арганізуюцца ва ўмовах блізкароднаснага беларуска-рускага білінгвізму і накіравана ў тым ліку на засваенне імі дзвюх дзяржаўных моў [1, с. 10—11].

Такім чынам, выхавальнікі дашкольнай адукацыі груп ранняга ўзросту і тым больш груп дашкольнага ўзросту, у якіх, у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам дашкольнай адукацыі у групах з рускай мовай навучання і выхавання з'яўляюцца заняткі спецыяльна арганізаванай дзейнасці «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», абавязаны ў дастатковай ступені валодаць беларускай мовай для яе выкарыстання ў адукацыйным працэсе ў розных відах дзейнасці як з дзецьмі, так і з іх бацькамі, ствараючы ўмовы для асваення дзецьмі нацыянальна-моўнай культуры. Веданне беларускай мовы неабходна выхавальніку дашкольнай адукацыі, кіраўніку фізічнага выхавання, музычнаму кіраўніку і іншым педагагічным работнікам для рэалізацыі задач вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

У той жа час у працэсе павышэння кваліфікацыі ў дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» у рамках круглых сталоў, прысвечаных пытанням выкарыстання беларускай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, большасць слухачоў з ліку кіраўнікоў адзначаюць недастатковую гатоўнасць педагагічных работнікаў для забеспячэння якаснай арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове. Кіраўнікі адзначаюць, што работа па забеспячэнні гатоўнасці педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі ва ўстановах адукацыі праводзіцца фрагментарна, бо не ўсе кіраўнікі могуць вызначыць тыя арганізацыйна-кіраўнічыя механізмы, якія дапамаглі б выправіць становішча, якое склалася на гэты момант. Забеспячэнне якаснага адукацыйнага працэсу немагчыма без забеспячэння граматнага кіраўніцтва ім. Кіраўнікі ўстановы дашкольнай адукацыі не толькі абавязаны ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі валодаць беларускай мовай, але і ствараць арганізацыйна-метадычныя ўмовы, якія дазваляюць забяспечыць якасць адукацыйнага працэсу па рэалізацыі задач адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін». З гэтай мэтай выкладчыкамі кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» распрацавана вучэбная праграма павышэння кваліфікацыі загадчыкаў і намеснікаў загадчыкаў па асноўнай дзейнасці ўстаноў дашкольнай адукацыі, спецыяльных дашкольных устаноў «Арганізацыйна-метадычныя асновы эфектыўнага выкарыстання беларускай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі».

У змест распрацаванай праграмы павышэння кваліфікацыі ўваходзяць тры блокі. Першы блок прысвечаны канцэптуальным асновам выкарыстання беларускай мовы. У першую чаргу разглядаюцца пытанні каштоўнасцей нацыянальнай культуры ў сучасным адукацыйным працэсе і беларускай мовы як сродка засваення нацыянальнай культуры дзецьмі ранняга і дашкольнага ўзросту. Паказваецца, якім чынам інтэграцыя відаў нацыянальнага мастацтва ў адукацыйным працэсе спрыяе авалоданню дзецьмі асновамі

нацыянальнай культуры. Раскрываюцца пытанні стварэння ўмоў для далучэння выхаванцаў да беларускай мовы як аднаго з асноўных механізмаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення дзецьмі нацыянальнай культуры, станаўлення самасвядомасці. Таксама разглядаюцца актуальныя праблемы папулярызацыі беларускай мовы ва ўстанове адукацыі як з рускай, так і з беларускай мовамі навучання і выхавання.

Тэма «Прававыя і арганізацыйныя асновы выкарыстання беларускай мовы ва ўстанове дашкольнай адукацыі» раскрывае пытанні нарматыўнага прававога і навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу на беларускай мове. Паказваюцца асаблівасці навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу ва ўстановах дашкольнай адукацыі ў групах з рускай і беларускай мовай навучання, якое выдаецца як на рускай, так і на беларускай мове.

Стварэнне адукацыйнага асяроддзя разглядаецца як умова далучэння да беларускай мовы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. Падчас заняткаў слухачы ажыццяўляюць мадэляванне асяроддзя ў розных узроставых групах, якое будзе спрыяць далучэнню выхаванцаў да нацыянальнай культуры.

Планаванне дзейнасці ўстановы дашкольнай адукацыі па далучэнні ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу да беларускай мовы разглядаецца з улікам сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага двухмоўя. Спецыфіка планавання і арганізацыі адукацыйнага працэсу разглядаецца на аснове комплекснага характару авалодання дзецьмі дзяржаўнымі мовамі ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі патрабаваннямі ў групах з рускай і беларускай мовамі навучання. Дзейнасць па распрацоўцы плана адукацыйнага працэсу ў першую чаргу накіравана на засваенне абноўленага зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі ў адукацыйная галіне «Развіцце маўлення і культура маўленчых зносін».

Вялікая ўвага нададзена пытанням павышэння прафесійнага ўзроўню педагагічных работнікаў для лінгвістычнага і маўленчага развіцця выхаванцаў ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя. Разглядаюцца пытанні патрабаванняў да педагагічных работнікаў, якія рэалізуюць вучэбную праграму дашкольнай адукацыі. Прадстаўлены сучасныя падыходы да арганізацыі метадычнай работы з педагагічнымі кадрамі ва ўмовах білінгвізму, якія забяспечваюць прафесійна-маўленчую гатоўнасць педагогаў да навучання дзяцей беларускай мове. Прадугледжана практыка-арыентаваная дзейнасць па асваенні і распрацоўцы актыўных форм і інтэрактыўных метадаў работы з педагогамі, накіраваных на забеспячэнне іх прафесійна-маўленчай гатоўнасці ў адпаведнасці з яе кампанентамі, апісанымі ў тэхналогіі Н. С. Старжынскай: *лінгвістычная* — валоданне рускай і беларускай мовамі, здольнасць ажыццяўляць іх супастаўляльна-параўнальны аналіз (фанетычны, лексічны, граматычны); *камунікатыўная* — здольнасць мець зносіны на беларускай і рускай мовах як у штодзённым жыцці, так і ў адукацыйным працэсе; *лінгвадыдактычная* — здольнасць выкарыстоўваць на практыцы палажэнні метадычнай навукі аб навучанні дзяцей роднай і іншым мовам; *народазнаўчая* — наяўнасць ведаў аб гістарычным мінулым сваёй краіны і яе сучаснасці, побыце, культуры, звычаях і традыцыях народа [2].

Падрабязна разгледжаны пытанні асаблівасці працы з выхаванцамі па далучэнні да беларускай мовы, нацыянальнай культуры, фарміраванні ў выхаванцаў устойлівай цікавасці і станоўчых адносін да роднай мовы ў спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці. Метадалагічныя асновы выкарыстання беларускай мовы ў адукацыйным працэсе прадстаўлены ў тэме, прысвечанай тэхналогіям работы па далучэнні да беларускай мовы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу. Перш за ўсё створаны ўмовы для актуалізацыі валодання слухачамі зместам тэхналогій, накіраваных на маўленчае і лінгвістычнае развіццё выхаванцаў на беларускай мове, для далейшага стымулявання засваення і выкарыстання дадзеных тэхналогій выхавальнікамі і іншымі педагагічнымі работнікамі. Прадстаўлены тэхналогіі працэсу маўленчага і лінгвістычнага развіцця дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя (Н. С. Старжынская) [2]; працэсу мастацка-маўленчага развіцця дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя (Д. М. Дубініна) [3].

Разглядаюцца пытанні стварэння камунікатыўнага асяроддзя, якое забяспечвае ўключэнне дзвюх моў у разнастайныя віды дзіцячай дзейнасці, а таксама пытанні правядзення спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці са зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

З мэтай распаўсюджвання эфектыўнага вопыту па пытаннях арганізацыі спрыяльных умоў для развіцця маўленчых навыкаў, далучэння выхаванцаў да беларускай нацыянальнай культуры, паспяховасці фарміравання двухмоўя, стварэння моўнага асяроддзя, рэалізацыі зместу вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі на беларускай мове прадугледжана наведванне ўстановы дашкольнай адукацыі.

Змест праграмы павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў улічвае неабходнасць аб'яднання намаганняў педагагічнага калектыву і бацькоўскай грамадскасці як закладу паспяховасці далучэння дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту да роднай мовы, беларускай нацыянальнай культуры. Арганізацыя эфектыўнага ўзаемадзеяння з бацькамі па стварэнні неабходнага камунікатыўнага асяроддзя выхаванцаў ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя ўключае ўдзел бацькоў у адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі па пытаннях авалодання дзецьмі беларускай мовай, у тым ліку дае магчымасць дзецям фармуляваць думкі на дзвюх мовах, узаемадзеянне ўстановы дашкольнай адукацыі, сям'і і соцыума па папулярызацыі беларускай мовы, выкарыстанне магчымасцей анлайн-зносін ва ўмовах двухмоўя для арганізацыі эфектыўнага ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Такім чынам, змест праграмы павышэння кваліфікацыі, распрацаванай выкладчыкамі кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», улічвае ўсе накірункі арганізацыйна-метадычнай дзейнасці кіраўніка па забеспячэнні выкарыстання беларускай мовы ва ўстановах дашкольнай адукацыі, раскрываючы як тэарэтычныя, так і практычныя аспекты.

Рэпазіторый БарДУ

**Заключэнне.** Менавіта кіраўнік у першую чаргу адказны за адпаведнасць якасці ажыццяўляльнага адукацыйнага працэсу патрабаванням адукацыйнага стандарту дашкольнай адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыі з улікам той спецыфічнай лінгвакультурнай сітуацыі, якая існуе ў Рэспубліцы Беларусь. Ад яго залежыць, наколькі будуць забяспечаны арганізацыйна-мэтадычныя ўмовы, якія спрыяюць выхаванню ў дзяцей нацыянальнай самасвядомасці, на аснове авалодання імі нацыянальна-моўнай культурай беларускага народа. Распрацаваная праграмма павышэння кваліфікацыі павінна актуалізаваць матывацыю слухачоў з ліку кіраўнікоў на забеспячэнне эфектыўнага арганізацыйна-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу ва ўстановах дашкольнай адукацыі па рэалізацыі задач адукацыйнай галіны «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» з дапамогай стварэння спрыяльных умоў для аб'ектыўнага ўспрымання зместу асноўных нарматыўных прававых актаў па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы, садзейнічання павышэнню прафесійнай кампетэнтнасці па пытаннях стварэння ўмоў для далучэння да беларускай мовы дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, фарміравання ўсведамлення аб тым, што далучэнне да беларускай мовы суб'ектаў адукацыйнага працэсу з'яўляецца прыярытэтным напрамкам дзейнасці на сучасным этапе развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Аб арганізацыі ў 2019/2020 навучальным годзе адукацыйнага працэсу ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю [Электронны рэсурс] : інструкт.-метад. пісьмо М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь : зацв. 10.07.2019 намеснікам Міністра адукацыі Рэсп. Беларусь Р. С. Сідарэнка. — Рэжым доступу: https://schoolsad-kolpen.schools.by/pages/nstruktyna-metadychnae-psmo-mnsterstva-adukatsy-respublk-belarus-ab-arganzatsy-adukatsyjnaga-pratsesu-va-stanovah-dashkolnaj-adukatsy-u-20182019-navuchalnym-godze . — Дата доступу: 28.01.2020.
2. *Старжынская, Н. С.* Тэхналогія працэсу маўленчага і лінгвістычнага развіцця дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя [Электронны рэсурс] / Н. С. Старжынская. — Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/725 . — Дата доступу: 27.12.2019.
3. *Дубініна, Д. М.* Асноўныя характарыстыкі тэхналогіі працэсу фарміравання выразнага маўлення дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя [Электронны рэсурс] / Д. М. Дубініна. — Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/13243 . — Дата доступу: 27.12.2019.



УДК 373



**Хвостенко Людмила Мечиславовна**
*Государственное учреждение образования «Санаторный ясли-сад № 9 г. Сморгони», Сморгонь, Республика Беларусь, hvostenko1973@mail.ru*


## НАРОДНАЯ ИГРУШКА КАК СРЕДСТВО ПОЛИКУЛЬТУРНОГО ВОСПИТАНИЯ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА


Статья посвящена проблеме поликультурного воспитания детей дошкольного возраста посредством народной игрушки. Народная игрушка — это неисчерпаемый источник педагогического материала, основа нравственного и патриотического воспитания. Использование её в работе с детьми дошкольного возраста способствует освоению ими культурных традиций, заложенных в ней, формирует интерес к народному творчеству и любовь к своей Родине, учит проявлять положительное эмоциональное отношение к людям своей национальности, уважение к другим народам.



**Ключевые слова:** поликультурное воспитание; народная игрушка; дети дошкольного возраста.



**Khvostsenko Liudmila Mechislavovna**
*Smorgon Nursery-kindergarten of sanatory type № 9, Smorgon, Belarus, hvostenko1973@mail.ru*


## FOLK TOY AS A MEANS OF MULTICULTURAL EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN


The article is devoted to the problem of multicultural education of preschool children through folk toys. A folk toy is an inexhaustible source of pedagogical material, the basis of moral and patriotic education. Using it in work with preschool children promotes their development of the cultural traditions laid down in it, generates interest in folk art and love for their homeland, teaches to show a positive emotional attitude towards people of their nationality, respect for other nations.



**Key words:** multicultural education; folk toy; preschool children.


**Введение.** В условиях глобализации современного общества особое внимание приобретает проблема поликультурного воспитания детей. Приобщение к культурным ценностям народов становится неотъемлемой частью современного образования. В Кодексе Республики Беларусь об образовании указывается, что нравственное воспитание детей должно быть направлено на приобщение обучающихся к общечеловеческим


© Хвостенко Л. М., 2020





Репозиторий БарГУ